развиваться: читать, заниматься наукой, повышать квалификацию, устанавливать связи с производством, решать другие многочисленные задачи, о которых много написано и сказано в последнее время. Реальность же такова – высокая нагрузка, невысокая зарплата (как следствие – поиск возможностей подзаработать). Данную проблему вуз самостоятельно решить не может. Это, в первую очередь, задача государства.

Другая серьезная проблема – качество абитуриента. Здесь вопрос переносится в плоскость школьного образования, подготовки школьника к дальнейшему обучению в вузе. Уже в школе преподавание должно быть сориентировано не только на усвоение «прописных истин», а на то, чтобы научить мыслить, иначе такой студент будет не готов к активному участию в инновационном образовательном процессе.

Осуществляя переход к образованию нового типа необходимо найти разумный баланс между двумя его взаимосвязанными сторонами: сохранение «традиционности», устойчивости положительного, что наработано в сфере образования и использование новых подходов, технологий, практик, при помощи которых образовательный процесс будет эффективно откликаться на вызовы и потребности социально-экономического развития белорусского государства и общества.

УДК 378.01

## КРЫЗІС АФІЦЫЙНАЙ АДУКАЦЫІ

**Лемех У.В.**
УА “Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт”
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Жыцьцё такое вялікае і яшчэ незразумелае,
што ня можа быць штампаваных, для ўсіх абавязковых, шляхоў.
**Абдзіраловіч І. , Вільня, 1921 г.**

Вышэйшая адукацыя завяршае этап эмбрыянальнага росту і легалізацыі кадравай адзінкі ў эканамічную, даволі цынічную арганізацыю здабывання “хлеба и зрелищ”. Розныя эканомікі блукаюць ў пошуках падыходаў, ідэй і сцэнараў траўмабяспечнай кадыфікацыі маладога жыцця, яго інтэграцыі ў цвёрды закон падпарадкавання. Беларускі варыянт адаптацыі былога выпускніка ВНУ да “правды жизни” можна характаразаваць як постсавецкі, у каторым ВНУ – філія бюджэтна-размеркавальнай палітыкі, дзе на адным баку-падаткаплацельшчыкі, пасярэдзіне-арганізаваная бюракратыя, на выхадзе-бюджэтныя месцы, “священные коровы” сацыяльнай справядлівасці. Чысты варыянт калектывізацыі ВНУ заснаваны на абагульненні, цэнтралізацыі і кантралюемым размеркаванні бюджэта з апорай на закон.

На малюнку 1 паказана, што адукацыя, кіраваная законам падпарадкавання, стварае іерархічную рашотку адчужанасці, руйнуе зваротную сувязь сям'і з творчай і фінансавай ініцыятывай. Трансфармацыя складанага і разнастайнага ў банальна-афіцыйнае на, першы погляд, з'яўляецца ўратавальным кругам ад дефіцыта багацця і лішка беднасці, але ж гэта не так.

Малюнак 1. Арганізацыя вышэйшай адукацыі, заснаваная на бюракрытызацыі сувязў і ўзаконенага прымусу да сумеснай дзейнасці




Для татальнай калектывізацыі вышэйшай адукацыі патрэбна высокая ступень абстрагавання, у першую чаргу, ад грошай, іх натуральнай крызіснасці, уліковых і крэдытных ставак, выпадковасці і самае галоўнае - плацежаздольнасці асобнай сям'і. Характэрна, што для савецкага перыяду, так званы, эканамічны крытэр навучання штучна звузіўся і прыняў форму каштарысу – бюракратычнага задання, для каторага эфектыўнасць сям'і абітурыента, а таксама рэнтабельнасць працы выпускніка ВНУ не мелі прынцыповага значэння. Закон народнагаспадарчых інтарэсаў зліквідаваў вузкія брамы жыцця, зрабіў незразумелае і нават канфліктнае - звычайным, простым, масавым. Так стваралася эра пазаэканамічнага, вузка галіновага, правінцыйнага навучання

Калектыўная вышэйшая адукацыя з'яўляецца задачай па размеркаванню бюджэтных, штучна калектывізаваных сродкаў, на чале якіх стаіць арганізаваная бюракратыя, таму:

■ ВНУ не аказвае аніякай паслугі, а толькі спажывае даведзеныя зверху каштарысы выдаткаў у адпаведнасці з зацверджанымі нормамі занятасці выкладчыкаў і студэнтаў. У стане дакладных іерархічных зносін нельга сказаць "што такое добра, а што – дрэнна".

■ Студэнты і выкладчыкі падпарадкаваны прынцыпу абавязковай (больш-меньш нарміраванай занятасці), якая паводле закона павінна прывесці да станоўчага выніку.

■ Заробкі выпускнікоў ВНУ ніякім чынам не ўплываюць на фінансавую дзейнасць ВНУ, стан яго рэпутацыі.

■ Плацельшчыкі падаткаў ўспрымаюць фінансаванне вышэйшай адукацыі як абавязак, а не бізнес-план.

■ Камерцыяналізацыя вышэйшай адукацыі з'яўляецца дадатковым падаткам, больш дэцэнтралізаваным, але ў такой жа ступені адчужаным ад эфектыўнасці.

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГАУ

з усімі атрыбутамі ўзаконенай (фармальнай) этыкі.

Мяжа савецкага ўплыву на адукацыю была даволі акрэслінай і ў нейкім сэнсе канструктыўнай пакуль жыццевыя акалічнасці суіснавалі ў зоне штучных імператываў, адчужаных ад замежнай валюты, міжнародных абменаў, крызісаў, інтэрнэту. Спадзяюся, што наступны прыклад дазволіць аценіць стан рэчаў, пры якім ўтрыманне бюджэтных месцаў можа ператварыцца ў вялікую ілюзію і стратны праект.

Нельга забальзамаваць адукацыю і вывесці яе з працэсу жыцця, нават калі закон адстойвае статычнасць ведаў. Змест вышэйшай адукацыі выключна фрагментарны: каб "вырабіць" поўнавартаснага кадра эканомікі трэба разлічваць на даволі працяглы падаткавы тэрмін у 38 гадоў (60-22), дзе 60 – чакаемы ўзрост заканчэння працоўнай дзейнасці, 22 – разліковы перыяд навучання ў школе і ВНУ. Перспектыўны падыход да навучання не дазваляе ігнараваць якасць нацыянальнай валюты і эканомікі цалкам. Зараз беларускі рубель вядзе сябе даволі вульгальна, не прэтэндуе на далекія перспектывы і штогод старэе на 14% (сакавік 2009 г). Бюджэт эканомікі Беларусі амаль што на 90% фінансуецца дэз'арганізаванымі юрыдычнымі асобамі, таму не патрабуе ад законаведаў адказнасці ў дачыненні планаў канкрэтнай сям'і.

Эканамічныя ўмовы спрыяльнага бюджэтнага фінансавання адукацыі, калі сярэднія выдаткі на адно бюджэтнае месца ў перыяд «довузовской» падрыхтоўкі складаюць ў эквіваленце 550 $/год, «вузовской» – 1700 $/год размешчаны ў табліцы.

| | **Адэкватны заробак эканамічна актыўнага кадра*** | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Структура падаткаў (фізычныя асобы \| юрыдычныя асобы)** | **10\|90** | **50\|50** | **10\|90** | **50\|50** |
| **Стаўка рэфінансавання, % за год** | **5%** | **5%** | **14%** | **14%** |
| В-1. 3% падатак з заробку | $5 400 | $26 998 | $34 634 | $173 170 |
| В-2. 6% падатак з заробку | $2 700 | $13 499 | $17 317 | $86 585 |
| В-3.12% падатак з заробку | $1 350 | $6 749 | $8 659 | $43 293 |
| | ***нарматыў ФЗП у адносінах да выручкі прадпрыемства - 20%** | | | |

Бюджэтнае фінансаванне адукацыі пры "таннай" нацыянальнай валюце патрабуе высокіх заробкаў і таму з'арыянтавана на даволі вузкую, дастаткова заможную частку насельніцтва. Неадэкватнымі выглядаюць аргументы, якія актуальнасць "бесплатной" адукацыі тлумачуць беднасцю насельніцтва, асабліва вясковага. Больш таго, калектывізацыя адукацыі шукае выйсце ў нізкай сацыяльнай актыўнасці насельніцтва, падпарадкаванне бюджэта палітыцы вузкіх прамысловых груповак і шырокага кола чынавенства.

ЛІТАРАТУРА:

Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветапогляду / І. Абдзіраловіч, Мн.: Навука і тэхніка. – 1993.